# ДА 130-ГОДДЗЯ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

*Асобы*

Алена ЯРМОЛЕНКА,
кандыдат філалагічных навук

## МАКСІМ ГАРЭЦКІ – ПІСЬМЕННІК, ПАДЗВІЖНІК, ГУМАНІСТ

УДК 821.161.3–19:09

У артыкуле адлюстравана ўзаемасувязь жыцця і творчасці М. Гарэцкага, уплыў біяграфіі пісьменніка на філасофскую канцэпцыю яго аўтабіяграфічных твораў. Адзначаны ўклад пісьменніка ў развіццё розных галін беларускай навукі і культуры. Даследавана творчая дзейнасць М. Гарэцкага, вынік якой – асэнсаванне падзей мяжы XIX–XX стст., вывучэнне псіхалогіі асобы ў пагранічнай сітуацыі, праблемы захавання чалавечнасці ў час гуманітарных катастроф. Вызначана надзённасць і ўніверсальнасць праблематыкі мастацкай прозы М. Гарэцкага, якая адпавядае духоўным патрабаванням сучаснага грамадства.

Ключавыя словы: *пісьменнік, падзвіжнік, аўтабіяграфізм, псіхалагізм, асоба, чалавечнасць, хроніка жыцця.*

The article reflects the relationship between the life and work of M. Haretski, the influence of the writer's biography on the philosophical concept of his autobiographical works. The writer's contribution to the development of various branches of Belarusian science and culture is noted. The creative activity of M. Haretski is studied, the result of which is the understanding of the events of the era of the border of the 19th and 20th centuries, the study of the psychology of the person in the border situation, the problem of preserving humanity during humanitarian disasters. The relevance and universality of the problematic of M. Haretski's artistic prose, which meets the spiritual requirements of modern society, is determined.



Складаны лёс у жорсткі час гістарычных катаклізмаў выпаў на долю класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага. Пісьменнік прайшоў праз розныя жыццёвыя выпрабаванні: удзел у ваенных дзеяннях, цяжкае раненне, зняволенне і высылка. Але нягледзячы на пакуты і боль, ён у самых цяжкіх абставінах вайны і высылкі верыў у чалавечнасць. Яго жыццёвы шлях – найлепшы доказ існавання незвычайнай працаздольнасці і адказнасці, дабрыні і міласэрнасці, самаахвярнасці і шчырасці, сціпласці і сумленнасці.

Максім Гарэцкі (18 лютага 1893 г., в. Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павета – 10 лютага 1938 г., Вязьма) – пісьменнік, педагог, крытык, публіцыст, перакладчык, лексікограф і гісторык літаратуры, адзін з пачынальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы. Ён зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускай філасофіі і літаратуры, фарміраванне нацыянальнай культуры і самасвядомасці. З поўнай унутранай аддачай ён спалучаў практычную творчую дзейнасць з тэарэтычнай, рыхтаваў надзённыя публіцыстычныя артыкулы, збіраў лексічны матэрыял для слоўнікаў, запісваў народныя песні.

Дзейнасць М. Гарэцкага можна ахарактарызаваць як падзвіжніцтва, пра якое згадвае М. Мушынскі ў манаграфіі "Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі" [1]. Ён бесперапынна працаваў сам і натхняў іншых на працу па адраджэнні беларускай мовы, развіцці літаратуры, аднаўленні культуры беларускага народа. За адносна кароткі тэрмін ён выканаў карпатлівую працу ў розных галінах навукі і культуры, стварыўшы аснову, на якой змаглі плённа працаваць наступныя пакаленні навукоўцаў і пісьменнікаў.

Максім Гарэцкі – аўтар апавяданняў, драматычных абразкоў, п'ес, аповесцей "У чым яго крыўда", "Меланхолія", "Ціхая плынь", "Дзве душы", дакументальна-мастацкіх запісак "На імперыялістычнай вайне", рамана "Віленскія камунары", эпапеі "Камароўская хроніка", філасофскай прытчы "Скарбы жыцця". Спадчына пісьменніка – літаратурна-крытычныя працы «"Малад-

няк" за пяць гадоў. 1923–1928», "Хрэстаматыя беларускае літаратуры. XI век – 1905 г.", першая "Гісторыя беларускае літаратуры", "Руска-беларускі слоўнік" (з Гаўрылам Гарэцкім), "Беларуска-расійскі слоўнічак", "Практычны маскоўска-беларускі слоўнік" (з Міколам Байковым), зборнік песень "Народныя песні з мелодыямі" (мелодыі запісалі Я. Ягораў і М. Аладаў).

Празаік і навукоўца апярэдзіў час, у значнай ступені прадвызначыў лёс беларускага прыгожага пісьменства. Апавяданні, аповесці, драматычныя творы М. Гарэцкага гучаць актуальна і сёння, узнятыя ім праблемы застаюцца надзённымі і вострасацыяльнымі. Яго творы параўнальныя з найлепшымі ўзорамі сусветнай літаратуры. Такім чынам, спадчына М. Гарэцкага патрабуе далейшага асэнсавання, паколькі адпавядае духоўным патрабаванням сучаснага грамадства.

З самага пачатку творчай дзейнасці малады пісьменнік паспрабаваў даць адказ на філасофскія і маральна-эстэтычныя пытанні, узбагаціў беларускую літаратуру арыгінальнымі творамі, якія вызначаліся актуальным зместам. Творчы дэбют М. Гарэцкага адбыўся ў 1913 г., калі на старонках газеты "Наша Ніва" было апублікавана апавяданне "У лазні". А ўжо праз год выйшаў зборнік "Рунь", куды ўвайшла большасць празаічных твораў, змешчаных у "Нашай Ніве". Першы зборнік стаў асновай далейшай творчасці М. Гарэцкага, з яго ўзялі пачатак наступныя буйныя празаічныя і драматычныя творы пісьменніка.

У беларускім літаратуразнаўстве адзначаецца незвычайная творчая сталасць пісьменніка, магутны талент, які праявіўся ўжо ў першым зборніку (М. Караткоў, М. Мушынскі, А. Макарэвіч, З. Мельнікава). Так, А. Макарэвіч у манаграфіі "У розных стылявых накірунках: праблема жанру і стылю ў апавяданнях 20-х гадоў М. Гарэцкага і Ц. Гартнага" звяртае ўвагу: «У апавяданнях М. Гарэцкага яўна прасочваецца актыўны зварот аўтара да адлюстравання пошукаў сутнасці быцця асобай: адукаванымі маладымі людзьмі – выхадцамі з сялянскага асяроддзя ("Рунь", "У лазні", "Роднае карэнне", "У чым яго крыўда?"). Пры гэтым своеасаблівым ідэйным асвятленнем такому пошуку служыць выразнае ў яго мудрасці і справядлівасці разуменне жыцця сялянамі, якія філасофскі асэнсоўваюць жыццё, прайшоўшы праз яго "пагоркі і нізіны", спасцігаючы праз гэты пуць аснову, на якой павінны будавацца чалавечыя адносіны» [2, с. 15–16].

Максім Гарэцкі быў адным з першых беларускіх пісьменнікаў, у творчасці якога знайшлі адлюстраванне падзеі Першай сусветнай вайны. Новая для беларускай літаратуры тэма вялікай народнай трагедыі патрабавала пошукаў адметнага падыходу да яе асвятлення. У апавяданнях "Рускі", "Генерал", "Літоўскі хутарок", аповесці "На імперыялістычнай вайне" М. Гарэцкі сканцэнтраваў увагу на супрацьпастаўленні вайны мірнаму існаванню чалавека, даследаванні ўплыву жахлівых ваенных здарэнняў на псіхалогію героя. Прозу М. Гарэцкага вылучаюць: максімальная дакладнасць, дакументальнасць адлюстравання батальных сцэн і побыту салдатаў; набліжанасць аўтара да героя, аўтабіяграфізм; увага да ўнутранага свету героя, аналіз маральна-этычных праблем, якія выклікае існаванне пратаганіста ў пагранічнай сітуацыі.

Максімальная набліжанасць аўтара да героя ўзмацняе трагічны акцэнт у адлюстраванні вайны. Маральныя пошукі, абвостраныя да мяжы, паказаны не ў гераічны час салдата, а ў будні вайны. Апавяданні і аповесці М. Гарэцкага адлюстроўваюць трагізм вайны, нярэдка іх можна вызначыць як "аптымістычныя трагедыі", галоўныя героі іх – прадстаўнікі аднаго ўзвода, роты, батальёна, палка. Творы Гарэцкага далёкія ад рамантычнага адлюстравання героікі вайны. У іх асэнсавана штодзённая, цяжкая праца салдата. Падрабязнае апісанне ўласнага франтавога вопыту дапамагае раскрыць пачуцці і думкі героя, характары і лёсы яго таварышаў, барацьбу з ворагам, з абставінамі, з уласнай слабасцю, з наступствамі вайны.

У працэсе асэнсавання асабістых уражанняў і назіранняў М. Гарэцкі, на думку сучасных даследчыкаў, сфарміраваў экзістэнцыйны погляд на чалавека і свет. Т. Тарасава сцвярджае: "Глабальна асэнсоўваючы сітуацыю чалавека пачатку XX ст., выяўляючы найскладанейшую дыялектыку ўзаемаадносін людзей у свеце, эвалюцыю іх свядомасці, пісьменнік у рэчышчы еўрапейскага літаратурнага працэсу ўздымае праблему маральных меж, фармулюе канцэпцыю суадносін розуму і маралі, праблему грамадства без Бога. Назіранні, зробленыя М. Гарэцкім, раўназначныя адкрыццям у заходнееўрапейскай і рускай літаратурах М. Пруста, Ф. Кафкі, Р. Музіля, А. Белага, І. Буніна, У. Набокава і інш." [3, с. 14].

Такім чынам, у ваеннай прозе М. Гарэцкі звяртаецца да перажывання чалавекам свайго быцця. Пісьменнік аналізуе такія экзістэнцыйныя паняцці, як жах, трывога, клопат, віна і надзея. Увага аўтара сканцэнтравана на ўнутраным свеце герояў, якія павінны выжыць у пакутлівых выпрабаваннях вайны, эвалюцыя свядомасці герояў выходзіць на першы план, чытач перажывае крызісную сітуацыю праз думкі і пачуцці асобы.

Асаблівае месца галоўнага героя ў большасці значных твораў пісьменніка – адметная рыса

мастацкага дыскурсу М. Гарэцкага. У аповесцях "У чым яго крыўда?", "Меланхолія", "На імперыялістычнай вайне" ўвагу аўтара прыцягваюць дзеянні, думкі, пачуцці і перажыванні галоўнага героя. Іншыя персанажы служаць для раскрыцця характару пратаганіста, выступаюць фонам ці нават праекцыяй найважнейшых уласцівасцей яго натуры. Прыродныя замалёўкі і пейзажы амаль заўсёды падпарадкаваны настрою цэнтральнай фігуры, прырода адлюстроўвае адценні яго думак і пачуццяў. Такая цэнтралізацыя не выпадковая, яна прыводзіць, па меркаванні даследчыкаў, да з'яўлення новага тыпу аўтарскага псіхалагізму.

Пісьменнік адлюстроўвае свет думак, пачуццяў, мар – рэфлексію галоўнага героя. Важна адзначыць жаданне аўтара стварыць своеасаблівага героя свайго часу – Лявона Задуму. Дастаткова схематычныя вобразы Кліма Шамоўскага і Кастуся Зарэмбы з апавяданняў М. Гарэцкага ператвараюцца ў яскравы мастацкі вобраз, раскрыццю якога падпарадкавана дзеянне аповесцей "У чым яго крыўда?", "Меланхолія", "На імперыялістычнай вайне", трылогіі пра лёс і духоўныя пошукі інтэлігента-беларуса.

Трылогія пра лёс Лявона Задумы на поўную моц выявіла імкненне пісьменніка да стварэння інтэлектуальнай прозы, сінкрэтычнай па форме і зместу. Лёс інтэлігенцыі пачатку XX ст., даваеннае і ваеннае становішча беларускай вёскі асэнсаваны праз аналіз жыццёвага шляху аўтабіяграфічнага героя. М. Гарэцкі працуе на сумежжы жанраў, камбінуе эпісталярную прозу, дзённікавыя запісы, мастацкія апісанні і псіхалагічны аналіз. Па сутнасці, ён стварае аўтабіяграфічны, дакументальна-мастацкі твор пра жыццё беларускага інтэлігента.

Кніга "На імперыялістычнай вайне" па праблематыцы, глыбіні распрацоўкі складанага духоўнага свету галоўнага героя, раскрыцці трагічнага лёсу шматлікіх персанажаў можа быць аднесена да маштабнай аўтабіяграфічнай прозы, у якой выразна прысутнічаюць дакументальнасць і рэтраспектыўнасць, мемарыяльнасць і тыпізацыя, эстэтызацыя і суб'ектыўная ацэнка падзей. "Гарэцкі як мастак бачыў сваю задачу не толькі ў добрасумленным апісанні псіхалагічнага стану героя ва ўмовах ваеннага жыцця, а і ў раскрыцці ўсяго складанага комплексу чалавечых пачуццяў, дзе ў супярэчлівае адзінства зліваюцца свядомае і падсвядомае, рацыянальнае і інтуітыўнае. Пісьменнік не ўхіляецца ад таго, каб расказаць аб прарочым сне салдата, каб перадаць прадчуванні чалавека перад смерцю, трызненні параненага, паміраючага. Для Гарэцкага-пісьменніка не існавала забароненых тэм і сітуацый. Ён выступаў тут як сапраўдны даследчык і першаадкрывальнік новага ў сферы ўнутранага жыцця чалавека" [1, с. 317–318], – сцвярджае М. Мушынскі.

Індывідуальнасць аўтара, наватарскія рысы яго творчай манеры выявіліся ў асаблівай увазе да псіхалагічнага стану чалавека ў крызіснай сітуацыі, выбары паміж дабром і злом, жыццём і смерцю. Аўтабіяграфічнымі творамі пісьменнік закладвае традыцыю адлюстравання экзістэнцыйных праблем чалавека на вайне, якія знойдуць працяг у творах В. Быкава і Я. Брыля, І. Навуменкі і І. Пташнікава пра Вялікую Айчынную вайну.

Галоўнай кнігай у жыцці М. Гарэцкага можна назваць аповесць "Камароўская хроніка", цалкам надрукаваную толькі ў 1986 г. у 4-м томе Збору твораў пісьменніка. У маштабным эпічным палатне адлюстравана гісторыя беларускага народа з 1863 г. да 1935–1936 гг. М. Гарэцкі адным з першых у беларускай літаратуры пачаў ствараць суб'ектыўную рэальнасць, міфічную вёску Камароўка, расказваць пра яе месцазнаходжанне і гісторыю, быт яе жыхароў. Камароўка выступае ў творах пісьменніка як своеасаблівая мастацкая мадэль Беларусі. Аўтар асэнсоўвае лёс некалькіх пакаленняў вяскоўцаў на працягу стагоддзяў. "Камароўская хроніка", такім чынам, можа быць суаднесена з такімі сусветна вядомымі месцамі на віртуальнай карце мастацкай літаратуры, як вёска Курані І. Мележа, Ёкнапатофа У. Фолкнера.

Гісторыя стварэння аповесці гаворыць пра пільную ўвагу, якую аддаваў М. Гарэцкі напісанню сямейнай хронікі. Пісьменнік на працягу жыцця збіраў фактычны матэрыял для "Камароўскай хронікі". У ёй адлюстраваны мінулае і сучаснае сялянскага роду, хронікі сялянскага, а потым і гарадскога жыцця. Праца над аповесцю была настолькі важнай для аўтара, што ён працягваў яе ў высылцы. У неспрыяльных умовах, не маючы належнага прытулку і харчавання, вымушаны пісаць алоўкам на дрэннай паперы, ён ствараў хроніку беларускага побыту, легендарную вёску, якая адлюстроўвае гісторыю Беларусі. Гісторыю не столькі фактаграфічную, колькі эмацыйна-псіхалагічную, поўную легенд і паданняў, традыцыйных абрадаў і звычаяў, гісторыю душы нацыі.

Міхась Мушынскі адзначае: «Фактычны матэрыял для "Хронікі" ў значнай частцы быў сабраны, калі пісьменнік знаходзіўся яшчэ на волі. Мастацкая ж апрацоўка назапашанага адбывалася ў Вятцы. Але і тут неадольнае жаданне ажыццявіць даўнюю творчую задуму – праз гісторыю пэўнага сялянскага роду, гісторыю некалькіх камароўскіх сем'яў раскрыць лёс беларускага народа, працоўнай вёскі – натхняла пісьменніка, абуджала душэўную энергію, унутраныя сілы» [1, с. 462].

Невядомыя факты, якія сведчаць пра неспрыяльныя ўмовы працы над "Камароўскай хронікай", паведамляе Г. Кажамякін у артыкуле «Невядомыя купюры ў аповесці М. Гарэцкага "Камароўская хроніка"»: «Часам са зместу ўзноўленага тэксту яшчэ раз можна ўбачыць, у якіх найцяжэйшых умовах тварыў М. Гарэцкі. У адной вялікай купюры, дзе закранаецца тэма і арышту Лаўрыка, і іншых тагачасных жыццёвых рэальнасцяў, гучаць такія словы: "4. Артыкул у В. п. «Классово-чуждый». Вось табе і «ўдарнік». Заява аб звальненні. Размова з Мільчак. – Пачакай. Не падавай. Ты не прычым. 5. Хлопаў: «Пагавару са Скапіным». Пачынаю ўсяго баяцца. У жніўні паслаў рукап. «Віл. кам.» Па-руску не перапісаў. Няма грошы і паперы. Забар. карыст. машынкаю" [8. Арк. 75]» [4, с. 90].

"Камароўская хроніка" – сацыяльна-побытавы, сацыяльна-псіхалагічны, аўтабіяграфічны прыклад эпічнай прозы, вывучэнне якой застаецца надзённай праблемай літаратуразнаўства. "Хроніка" адрозніваецца дакументалізмам, які дазваляе паглыбіць аўтарскую самарэфлексію, выразна адлюстраваць псіхалагічныя, маральна-этычныя, мастацкія, ідэалагічныя, сацыяльна-палітычныя погляды аўтара. Менавіта гэта вылучае творчую манеру М. Гарэцкага – паглыблены псіхалагізм, асэнсаванне станаўлення і фарміравання нацыянальнага характару.

Плённая дзейнасць Максіма Гарэцкага можа служыць прыкладам самаадданасці і самаахвярнасці, падзвіжніцкай службы на карысць радзімы. Гісторыя жыцця пісьменніка адлюстравана ў лёсе герояў яго аўтабіяграфічных твораў. Яны прысвечаны вывучэнню асобы, выпрабаванню на мужнасць і чалавечнасць, асэнсаванню месца і ролі чалавека ў гістарычным працэсе. Вопыт пісьменніка садзейнічаў філасофскаму асэнсаванню падзей эпохі на мяжы стагоддзяў. М. Гарэцкі ў творах ставіць праблемы жыцця і смерці і вырашае іх у рэчышчы гуманістычных традыцый беларускай літаратуры. Каштоўнасць пытанняў, узнятых пісьменнікам, у іх універсальнасці і надзённасці для ўсіх народаў ва ўсе часы. Менавіта такой універсальнай і шматграннай выступае і творчасць Максіма Гарэцкага.

**Спіс літаратуры**

1. **Мушынскі, М.** Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі : жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 543 с.

2. **Макаревич, А. Н.** В разных стилевых течениях: проблема жанра и стиля в рассказах 20-х гг. М. Горецкого и Т. Гартного / А. Н. Макаревич. – Екатеринбург : Урал Плюс, 1995. – 178 с.

3. **Тарасава, Т. М.** Беларуская проза XX ст. у еўрапейскім літаратурным кантэксце : экзістэнцыялізацыя духоўнага свету героя : аўтарэф. дыс. … докт. філал. навук : 10.01.01 / Т. М. Тарасава ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. – Мінск, 2013. – 44 с.

4. **Кажамякін, Г. В.** Невядомыя купюры ў аповесці М. Гарэцкага "Камароўская хроніка" / Г. В. Кажамякін // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць : матэр. XVIII Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 11 чэрвеня 2010 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ. – Мінск, 2010. – С. 87–96.

## КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2023 год

### САКАВІК

**1 сакавіка** – 105 гадоў з дня выхаду ў свет грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты "Дзянніца". Выдавалася на беларускай мове ў Петраградзе і Маскве да 24 лютага 1919 г.

80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Пецюкевіча, паэта

**2 сакавіка** – 105 гадоў з дня нараджэння Алеся Бачылы (1918–1983), паэта, драматурга

100 гадоў з дня нараджэння Барыса Уладамірскага (1923–1991), беларускага акцёра

**3 сакавіка** – 80 гадоў з дня нараджэння Алега Коваля (1943–2007), балетмайстра, рэжысёра

**4 сакавіка** – 115 гадоў з дня нараджэння Янкі Шарахоўскага (1908–1973), празаіка, крытыка, літаратуразнаўцы

**5 сакавіка** – 125 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Шахрая (1898–1979), опернага рэжысёра, спевака

110 гадоў з дня нараджэння Льва Міхайлава (1913–1973), акцёра

100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Калашнікава (1923–1994), акцёра

**6 сакавіка** – 140 гадоў з дня нараджэння Івана Бялькевіча (1883–1960), мовазнаўцы

100 гадоў з дня нараджэння Анатоля Ляляўскага (1923–1995), рэжысёра, народнага артыста Беларусі

60 гадоў з дня нараджэння Вольгі Куртаніч (сапр. Мешчаракова), паэткі, празаіка

75 гадоў з дня нараджэння Ганны Мезенкі, мовазнаўцы

**7 сакавіка** – 85 гадоў з дня нараджэння Міхася Чарняўскага (1938–2013), археолага, пісьменніка

80 гадоў з дня нараджэння Алы Кабаковіч (1943–1985), літаратуразнаўцы, паэткі, перакладчыцы

70 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Кожуха (1953–2017), мастака

**8 сакавіка** – 105 гадоў з дня нараджэння Міколы Ткачова (1918–1979), празаіка

70 гадоў з дня нараджэння Ларысы Салодкінай, мастацтвазнаўцы, мастацкага крытыка

**9 сакавіка** – 140 гадоў з дня нараджэння Францішка Аляхновіча (1883–1944), драматурга, публіцыста, паэта, празаіка

**10 сакавіка** – 90 гадоў з дня нараджэння Серафіма Андраюка (1933–2022), крытыка, літаратуразнаўцы

**11 сакавіка** – 120 гадоў з дня нараджэння Тодара Кляшторнага (1903–1937), паэта, перакладчыка

*Заканчэнне на с. 38.*